па арганізацыі народных гульняў, свят, абрадаў. З вопытам арганізацыі правядзення народных святаў "Дзяды", "Каляды", "Гуканне вясны" пазнаеміліі ЦБ Я.Купалы, б-ка № 3 імя Маякоўскага, № 14 "Юнацтва", № 15 імя Цеткі.

Але, разам з тым, сення патрэбна адзначыць, што дзяржаўная эканомія на развіцці культуры стварыла у некаторай частцы грамадзян дэфіцыт духоўнасці, абыякавасці да высокага мастацтва і прыгажосці, да культурнай спадчыны і духоўных каштоўнасцей. Усе гэта сказваецца на камплектаванні і выкарыстанні бібліятэчных фондаў. З-за фінансавых цяжкасцей няма магчымасці, каб паступленні літаратуры адпавядалі попыту. Рост цэн на выданні літаратуры выклікае зніжэнне экзэмплярнасці. Бібліятэкі не ў поўным аб'еме атрымліваюць дакументы па папярэдніх заказах. Час патрабуе і лепшай прапаганды беларускай кнігі, каб гэта быў не выпадковы набор мерапрыемстваў, а прадуманая сістэма.

## УМЕЦЬ ПАЛЕМІЗАВАЦЬ

У.А.Фамін

Ва умовах палітычнага і духоўнага развіволення, пашырэння дэмакратыі усе большае значэнне набывае палеміка. На вялікі жаль яна ў нашым грамадстве нярэдка ператвараецца ў звычайную сварку. Але ж сварка і палеміка не маюць нічога агульнага. Яны - антыподы. Першая - прыкмета невыхаванасці, нізкай культуры. Другая ж - рыса асобы высокай культуры.

Майстэрства палемізаваць не прыходзіць да чалавека з малаком маці, не даецца яму ў спадчыну. Яму трэба вучыцца. Уменне весці дыялог - важнейшая састаўная частка красамоўства. Яшчэ Цыцэрон, адзначаючы вялікія магчымасці красамоўства для уздзейнічання на людзей, лічыў яго адным з галоўных сродкаў дзяржавы. Ен быў перакананы ў тым, што любы грамадскі ці дзяржаўны дзеяч павінен валодаць майстэрствам публічнага слова.

Шкада, што гэтаму не вучаць у нас ні ў школе, ні ў вышэйшых навучальных установах. Між тым, яшчэ ў старажытныя часы вуснаму слову надавалі вельмі вялікае значэнне. Напрыклад, у ста-

ражытнай Грэцыі былі повят і дапаможнікі. Так, Арыстоцель напісаў сур'ёзную працу у трох тамах, якая называлася "Рыторыка". Пэўна, адсюль пайшла назва спецыяльнай вучэбнай дысцыпліны – рыторыкі (ад слоў аратар, рытор).

Гэта навука даволі актыўна развівалася у перыяд сярэдневякоўя і пазней. У прыватнасці, у Расіі толькі у ХУП ст. было напісана некалькі прац па аратарскаму майстэрству, у тым ліку падручнікі Усачова "Рыторыка". Але сапраўдны уздым публічнага слова свецкага напрамку у нас звязаны з развіццём універсітэцкай адукацыі, з дзейнасцю М.Ламаносава.

У пачатку 30-х гадоў рыторыка пачала адраджацца у нашай краіне. Але затым яе забаранілі, як кібернетыку і многае іншае. Маўляў, гэта буржуазныя выдумкі, хоць нарадзілася яна за многія стагоддзі да палулення той буржуазіі.

Рыторыка, як і любая навука, мае свае законы, правілы і умовы, выкананне якіх дае найбольшы эфект у палеміцы. У многіх універсітэтах Еўропы у перыяд сярэдневякоўя шмат увагі удзялялася так званым дыспутацыям, спрэчкам. Гэтыя дыспутацыі патрабавалі ад удзельнікаў прытрымлівацца пэўных правіл. Сярод іх былі такія:

- не ужывай нетактоўныя выразы супраць процілеглага боку;
- не старайся быць правым, калі ісціна не на тваім баку;
- не пераносі асабістыя адносіны да праціўніка на прадмет спрэчкі.

Пры гэтым ад удзельнікаў дыспутацый патрабавалася, каб вялі яны палеміку сумленна, не падтасоўвалі факты, вялі дыялог адкрыта.

За найбольш актыўны і умелы удзел у спрэчках навучэнцы заахвочваліся. Напрыклад, пераможцам выдаваліся боты, спецыяльныя берэты і іншыя рэчы.

Правілы рыторыкі на працягу гісторыі развіваліся, удакладняліся. У дачыненні непасрэдна дыялога можна назваць такія, як паслухай другога, не перабіваючы яго, не выходзь за прадмет спрэчкі.

Сапраўды, спрэчка патрэбна не для спрэчкі, а для высвятлення ісціны. Нездарма яшчэ з даўніх часоў бытуе крылаты выраз – "У спрэчцы нараджаецца ісціна".

Адстойваючы свой тэзіс або канцэпцыю, удзельнікі палемікі не павінны хітраваць, спрабаваць выклікаць гнеў у працўніка. На гэта указваў вядомы рускі філосаф Паварнін, які ў пачатку нашага стагоддзя пісаў, што ў спрэчцы забараняецца перабіваць свайго апанента, павышаць голас, топаць нагамі і г.д.

Гэтыя патрабаванні надзенныя і сення. Мінулыя выбары народных дэпутатаў выявілі якраз гэты недахоп у вядзенні дыялогу. Каб дамагчыся перамогі над працўнікам, некаторыя кандыдаты ў дэпутаты, асабліва групы іх падтрымкі, корпаліся ў яго бруднай бялізне, падтасоўвалі факты. Іншы раз справа даходзіла да таго, што на людскі суд выносіліся факты шматгадовай даўнасці, якія па сутнасці не мелі прамога дачынення да вылучэння таварыша кандыдатам у народныя абраннікі.

Палемізуючыя бакі павінны заўседы памятаць, што іх бачанне рашэння пэўнай праблемы, асабліва калі яна мае вялікае грамадскае значэнне, яшчэ не з'яўляецца ісцінай у апошняй інстанцыі. Нават тады, калі праўда на тваім баку, а большасць цябе не разумее, не злуй, будзь цярплівым, настойліва пераконвай большасць у сваей праваце.

Канешне, гэта патрабуе вялікага такту, умення палемізаваць, чаго на жаль, многім не хапае.

## ПРАБЛЕМА ЎЗАЕМААДНОСІН ТРАДЫЦЫЙНАГА І САМАДЗЕЙНАГА У СУЧАСНАЙ МАСТАЦКАЙ КУЛЬТУРЫ

А.А.Скарына (аспірант)

Сення ў свеце хуткімі тэмпамі ўзрастае нацыянальная самасвядомасць народаў, нягледзячы на інтэрнацыялізацыю культуры і быта, якая выклікана пашырэннем міжнароднай інтэграцыі. Такая вострая патрэба звяртання да вопыту мінулага, да культурных каштоўнасцей, нацыянальных традыцый звязана з заклапочанасцю грамадства зберагчы сваю індывідуальнасць і непаўторную самабытнасць. Без самабытнасці і самапавагі немагчыма пазнаваць і навучыцца паважаць сябе і другіх. Таксама "нельга зразумець прыроду і сутнасць наватарства ў навуцы, мастацтве, тэхніцы, правільна растлу-